BELARUS Live

NEWSLETTER
14/12-21/12/07

**ПАЛІТЫКА**
▪Амбасадар Беларусі абвінавацiў ЗША ў парушэньні міжнароднага права
▪ЗША аспрэчылі абвінавачаньні беларускіх уладаў у парушэньні гарантыяў бесьпекі

**АФІЦЫЙНА**
▪ААН асудзіла Беларусь за парушэньне правоў чалавека

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Аляксандар Мілінкевіч зьвярнуўся да амбасадараў замежных краінаў з просьбай падтрымаць Артура Фінькевіча

**ЭКАНОМІКА**
▪"Камунарка" – найлепшая кандытарская фабрыка

**ГРАМАДЗТВА**
▪Беларусы паедуць за мяжу бяз штампу

**КУЛЬТУРА**
▪Полацак будзе найбуйнейшым турыстычным цэнтрам
▪У Гомелі адчыніцца Музэй рэдкай кнігі

На гэтым тыдні незалежная беларуская супольнасьць ды аналітыкі працягвалі ажыўлена камэнтаваць вынікі візыту расейскага прэзыдэнта Ўладзімера Пуціна ў Менск 13–14 сьнежня.

З аднога боку, ня спраўдзіліся найгоршыя для лёсу беларускай незалежнасьці прагнозы (маўляў, будзе падпісаны канстытуцыйны акт "саюзнае дзяржавы", што адкрые шлях да інкарпарацыі Беларусі ў склад Расеі). Зь іншага боку, на думку аналітыкаў, узмацняецца пагроза эканамічнага закабаленьня і "паўзучай анэксіі".

Знакавай падзеяй візыту можна лічыць супольны ўдзел двух прэзыдэнтаў 14 сьнежня ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцьця галаўнога офісу Банку ВТБ (Беларусь), у якім расейцы займелі 64,9% акцый. Як мяркуе беларускі эканаміст Яраслаў Раманчук, зараз Масква ўзяла курс на фінансавую экспансію. "Бліцкрыг што да захопу Беларусі праз канстытуцыйны акт ня ўдаўся, відавочна таму расейцы спрабуюць уцягнуць беларускія прадпрыемствы, фінансавую сыстэму ва ўласныя фінансавыя плыні, каб зрабіць краіну яшчэ болей залежнай".

Неўзабаве пасьля візыту Пуціна прадстаўнік расейскага "Газпраму" абвесьціў, што кошт паставак газу ў Беларусь у першым квартале 2008 году складзе 119 даляраў за тысячу кубічных мэтраў. Такой лагоднай цаны ад Расеі не атрымала ніводная іншая краіна СНД (для параўнаньня: Украіна будзе вымушаная плаціць па 179,5 даляра).

Аналітыкі схіляюцца да думкі, што такім чынам Масква аплачвае палітычную ляяльнасьць з боку Менску на пэрыяд прэзыдэнцкай кампаніі ў Расеі. Крамлю не хацелася б атрымаць у гэты напружаны час чарговую "газавую вайну" з рэзкімі заявамі беларускага кіраўніцтва і рызыкай для транзыту расейскіх энерганосьбітаў у Эўропу. Разам з тым практыка паквартальнага вызначэньня цаны (раней яна ўсталёўвалася адразу на цэлы год) дае Крамлю магчымасьць трымаць беларускі бок "на кручку". Экспэрты дапускаюць, што да канца 2008 году цана газу для Беларусі можа дасягнуць 150 даляраў.

Між тым дзяржаўны бюджэт наступнага году, прыняты 17 сьнежня ў другім чытаньні Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, грунтуецца на разьліку, што газ ня будзе даражэйшы за 125–128 даляраў. Такім чынам, пры жаданьні Масква можа стварыць

беларускаму ўраду вялікія фінансавыя праблемы. Ці, ва ўсякім разе, шантажаваць гэтым чыньнікам, каб дамагчыся прэфэрэнцыяў для расейскага капіталу. Аналітыкі не выключаюць, што падчас нядаўняга саміту ў Менску расейскі бок мог "выкручваць рукі", дамагаючыся продажу на выгадных умовах акцый шэрагу "блакітных фішак" – найболей прывабных беларускіх прадпрыемстваў, у прыватнасьці нафтахімічных.

У сувязі з гэтым можна казаць пра палітыку пугі і перніка. Пернікам выглядае заява Пуціна пра вылучэньне Беларусі стабілізацыйнага крэдыту памерам 1,5 мільярда даляраў на дастаткова выгадных умовах. Зрэшты, на думку фінансавых аналітыкаў, захапленьне беларускага ўраду замежнымі пазыкамі, якія сёлета бяруцца зь беспрэцэдэнтнай інтэнсіўнасьцю, пагражае праз тры-чатыры гады давесьці да небясьпечнай рысы замежны доўг краіны.

Тым часам зь 17 сьнежня ў Беларусі перастала дзейнічаць ранейшая сыстэма льготаў, якімі ў той ці іншай ступені карысталіся каля дзьвюх трацінаў жыхароў. У прыватнасьці, навучэнцы і пэнсіянэры страцілі права на праезд за паўцаны ў грамадзкім транспарце. Пэнсіянэры таксама мусяць зараз набываць лекі за поўны кошт.

Паралельна ўказам прэзыдэнта ўведзеная адрасная дапамога найболей неабароненым у сацыяльным пляне грамадзянам. Дзяржаўная падтрымка (штомесячная ці аднаразовая) будзе вылучацца на набыцьцё прадуктаў харчаваньня, лекаў, тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, адзеньня, абутку, праязных квіткоў, школьных прыладаў і "на іншыя патрэбы дзеля забесьпячэньня нармальнай жыцьцядзейнасьці". Такой дапамогай, паводле прагнозу, змогуць скарыстацца каля 210 тысяч прадстаўнікоў найбяднейшых слаёў.

Палітычная апазыцыя спрабуе скарыстаць гэтае непапулярнае рашэньне ўладаў дзеля палітызацыі насельніцтва і пашырэньня сваёй электаральнай базы. Аднак сацыяльныя пікеты, прымеркаваныя да скасаваньня льготаў, амаль паўсюдна былі забароненыя мясцовымі ўладамі. Болей шанцаў на ўздым вулічнай актыўнасьці ўвесну, бо прагназуецца значны рост кошту жыльлёва-камунальных паслугаў і спажывецкіх цэнаў. Інфляцыя сёлета перасягнула ўжо 10% пры афіцыйным прагнозе 6–8%.

Між тым 18 сьнежня прэзыдэнт Беларусі падпісаў указ аб зацьвярджэньні найважнейшых парамэтраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця краіны на 2008 год. Так, базавы прагнозны парамэтар тэмпу росту валавога ўнутранага прадукту вызначаны на ўзроўні 108–109%. Разам з тым ураду і Нацыянальнаму банку даручана распрацаваць комплекс дадатковых захадаў дзеля забесьпячэньня тэмпаў росту ВУП на 110–111%. Незалежныя адмыслоўцы лічаць, што гэта нерэальныя задачы. Плянаваньне, адзначаюць яны, ажыцьцяўляецца ў межах старой эканамічнай парадыгмы, без уліку імаверных энэргетычных шокаў ды неабходнасьці рэструктурызацыі эканомікі.

Як прыклад валюнтарызму прыводзіцца пастаўленая кіраўніком дзяржавы на пачатку году задача дасягнуць сёлета станоўчага сальда замежнага гандлю ў памеры 500 мільёнаў даляраў. Насамрэч, як паведаміў 18 сьнежня міністар эканомікі Мікалай Зайчанка, сальда замежнага гандлю Беларусі па выніках 2007 году, паводле папярэдняй ацэнкі, складзе 2,38 мільярда даляраў са знакам мінус. Гэты дэфіцыт пагражае ў пэрспэктыве стабільнасьці фінансавай сыстэмы краіны.

На лібэралізацыю эканомікі кіраўніцтва дзяржавы ідзе неахвотна і толькі пад ціскам абставінаў. Так, пратэсты прадпрымальнікаў змусілі падпісаць 17 сьнежня прэзыдэнцкі дэкрэт, які спрашчае парадак дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадараньня. У прыватнасьці, дазвольная працэдура рэгістрацыі зь 1 студзеня 2008 году замяняецца заяўнай.

Увогуле ж дробныя і непасьлядоўныя крокі ўраду ў пытаньні рэфармаваньня эканомікі незалежныя аглядальнікі называюць "адсяканьнем хваста за некалькі разоў".

## ПАЛІТЫКА

### Амбасадар Беларусі абвінаваціў ЗША ў парушэньні міжнароднага права

**Амбасадар Беларусі ў ЗША Міхаіл Хвастоў абвінаваціў Вашынгтон у тым, што санкцыі Злучаных Штатаў супраць Беларусі супярэчаць раней падпісаным пагадненьням.**

Маецца на ўвазе "Мэмарандум пра гарантыі бясьпекі", які быў падпісаны дзьвюма краінамі ў 1994 годзе пасьля таго, як Беларусь заявіла пра адмову мець на сваёй тэрыторыі ядзерную зброю. Цяпер беларускія ўлады нагадваюць, што тады Злучаныя Штаты ўзялі на сябе абавязак ня ўводзіць эканамічных мераў супраць Беларусі, а санкцыі, што дзейнічаюць зараз, парушаюць міжнароднае права.

### ЗША аспрэчылі абвінавачаньні беларускіх уладаў у парушэньні гарантыяў бесьпекі

**Паводле заявы намесьніка памочніка Дзяржсакратара ЗША па справах Эўропы й Эўразіі Дэвіда Крэмэра, "ЗША расцэньвае санкцыі ў адносінах Беларусі як цалкам адпаведныя палітычным дамоўленасьцям і абавязацельствам".**

Па словах Крэмэра, заява амбасадара Беларусі ў ЗША Міхаіла Хвастова пра парушэньне Вашынгтонам міжнароднага права зьяўляецца манэўрам з мэтаю адцягнуць увагу ад крытыкі Захадам беларускага палітычнага рэжыму.

14 сьнежня 2007 году Міністэрства фінансаў ЗША ўвяло санкцыі супраць канцэрну "Белнафтахім". Амэрыканскім кампаніям забаронена супрацоўнічаць зь "Белнафтахімам", а ўсе актывы прадпрыемства ў ЗША былі замарожаныя.

## АФІЦЫЙНА

### ААН асудзіла Беларусь за парушэньне правоў чалавека

**Генэральная Асамблея Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў асудзіла парушэньне правоў чалавека ў Беларусі. Падчас галасаваньня 72 краіны падтрымалі рэзалюцыю ў гэтай справе, 33 – прагаласавалі супраць і 78 краін устрымалася ад галасаваньня.**

Асудзіць парушэньне правоў чалавека ў Беларусі адмовіліся, між іншым, Расея, Куба, Карэя, Іран, Зімбабвэ.

У Міністэрстве замежных справаў Беларусі зазначылі, што большая частка краінаў не прагаласавала за прыняцьцё рэзалюцыі. Гэта сьведчыць аб тым, што яны ня хочуць быць удзельнікамі беспадстаўнай крытыкі Беларусі.
У сваю чаргу беларускія праваабаронцы лічаць дакумэнт вельмі патрэбным.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Аляксандар Мілінкевіч зьвярнуўся да амбасадараў замежных краінаў з просьбай падтрымаць Артура Фінькевіча

**Лідэр Руху "За Свабоду" Аляксандар Мілінкевіч, які зьяўляецца старшынём грамадзкага камітэту па вызваленьні Артура Фінькевіча, зьвярнуўся да амбасадараў замежных краінаў з просьбаю падтрымаць палітвязьня, аднога зь лідэраў "Маладога Фронту".**

10 траўня 2006 году Артур Фінькевіч быў асуджаны на два гады абмежаваньня волі за антыпрэзыдэнцкія графіці. Калі тэрмін абмежаваньня волі заканчваўся, хлопцу было прад'яўленае абвінавачаньне ва ўхіленьні ад адбываньня пакараньня.

Фінькевічу пагражае да трох гадоў пазбаўленьня волі.

Аляксандар Мілінкевіч просіць улады эўрапейскіх краінаў прыняць меры для ўзьдзеяньня на ўлады Беларусі з мэтаю вызваленьня палітзьняволеных.

## ЭКАНОМІКА

### "Камунарка" – найлепшая кандытарская фабрыка

**Кандытарская фабрыка "Камунарка" атрымала Гран-пры на рэспубліканскім конкурсе прадуктаў харчаваньня "Прадукт году-2007". Таксама фабрыка заняла першае месца ў намінацыях "Найлепшыя кандытарскія вырабы" і "Найлепшы чаканяд".**

"Камунаркаўскія" цукеркі, бадай, найбольш вядомыя ў краіне – гэта "Сталічныя", "Чырвоны каптурок", "Любімая Алёнка", "Мішка на паляне".

"Камунарка" была заснаваная ў 1931 годзе. Цяпер прадукцыя фабрыкі вядомая ня толькі ў Беларусі, але й па-за яе межамі. 25% кандытарскіх вырабаў прызначана на экспарт.

## ГРАМАДЗТВА

### Беларусы паедуць за мяжу бяз штампу

**Аляксандар Лукашэнка падпісаў указ пра скасаваньне дазвольнага штампу ў пашпарце "на выезд за межы Беларусі".**

Такім чынам, пасьля Новага году для выезду за мяжу трэба мець дзейны пашпарт ды не знаходзіцца ў адмысловай базе "невыязных". Нявыязнымі, напэўна, будуць асобы, у якіх неўрэгуляваныя фінансавыя абавязацельствы перад дзяржавай, ды тыя, на каго заведзеная судовая справа. Мяркуецца, што трапіць за мяжу ня змогуць больш за 100 000 беларусаў, якія будуць унесеныя ў гэтую базу.

### "Саюз-Чарнобыль Беларусі" зарэгістраваны ва Ўкраіне

Закончыўся працэс рэгістрацыі грамадзкага аб’яднаньня "Саюз-Чарнобыль Беларусі" ва Ўкраіне. Польскае радыё раней паведамляла, што аб’яднаньне беларускіх ліквідатараў наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС не зарэгістравалі ў Беларусі.

Старшыня Саюзу Аляксандар Ваўчанін зьвярнуўся ва ўкраінскае Міністэрства юстыцыі з просьбаю зарэгістраваць арганізацыю ва Ўкраіне. 18 сьнежня рэгістрацыя завяршылася.

## КУЛЬТУРА

### Полацак будзе найбуйнейшым турыстычным цэнтрам

**Полацак стане найбуйнейшым турыстычным цэнтрам у Беларусі. Прэзыдэнт краіны зацьвердзіў праграму разьвіцьця гораду на 2008–2012 гады.**

Заканчэньне працаў будзе прымеркавана да 1150-х угодкаў Полацку.

Акрамя новай інфраструктуры й рамонту старых будынкаў, будуць створаныя 3–5 тысячаў дадатковых месцаў працы. Плянуецца, што Полацак стане сучасным, канкурэнтаздольным і запатрабаваным комплексам турыстычных паслугаў у Беларусі. Мяркуецца, што цягам году горад будуць наведваць да 3 мільёнаў чалавек.

### У Гомелі адчыніцца Музэй рэдкай кнігі

**У Гомельскай абласной унівэрсальнай бібліятэцы ў студзені 2008 году плянуецца адкрыць Музэй рэдкай кнігі.**

У экспазыцыі будуць дэманстравацца букіністычныя рарытэты з фонду рэдкай кнігі. Сярод іх унікальныя асобнікі з фамільнай калекцыі кніг сям’і князёў Паскевічаў (маёнтак якіх знаходзіўся на тэрыторыі сучаснага Гомелю) і вельмі

рэдкія выданьні, датаваныя XVI–XX стагодзьдзямі. Ёсьць у калекцыі таксама ўсходнія рукапісы й кнігі зь бібліятэкі Напалеона Банапарта.

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.